ЦБС г. Гродно

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА КУЛЬТУРЫ
«ЦЭНТРАЛІЗАВАНАЯ БІБЛІЯТЭЧНАЯ
СІСТЭМА г. ГРОДНА»
ГРОДЗЕНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ЦЭНТРАЛЬНАЯ
БІБЛІЯТЭКА ІМЯ А. МАКАЁНКА
АДДЗЕЛ БІБЛІЯТЭЧНАГА МАРКЕТЫНГУ

# БІБЛІЯТЭКА – АДКРЫТЫ СВЕТ

З вопыту работы па абслугоўванні невідушчых карыстальнікаў у ДУК «ЦБС г. Гродна»



Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»

Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# БІБЛІЯТЭКА – АДКРЫТЫ СВЕТ

## З вопыту работы па абслугоўванні невідушчых карыстальнікаў у ДУК «ЦБС г. Гродна»

Гродна, 2018

Бібліятэка – адкрыты свет : з вопыту работы па абслугоўванні невідушчых карыстальнікаў у ДУК «ЦБС г. Гродна»/ Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; склад. А. С. Рубель ; рэд. Н. Ю. Наземцава. — Гродна, 2018. — 24 с.

Выданне змяшчае інфармацыю пра вопыт работы па абслугоўванні невідушчых карыстальнікаў у ДУК «ЦБС г. Гродна».

Адрасавана бібліятэчным спецыялістам.

# БІБЛІЯТЭКА – АДКРЫТЫ СВЕТ

Абслугоўванне людзей з абмежаваннямі па здароўі – адзін з прыярытэтных накірункаў дзейнасці дзяржаўнай установы культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна». Работа з невідушчымі карыстальнікамі і людзьмі з аслабленым зрокам арганізавана ў межах планаў мерапрыемстваў:

| |
|---|
| **«Абуджэнне да духоўнага жыцця»:** па духоўным выхаванні карыстальнікаў |
| **«Выхаванне патрыёта і грамадзяніна»:** па гісторыка-патрыятычным выхаванні дзяцей і моладзі |
| **«Будзем разам»:** па рабоце з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі насельніцтва |
| **«Мы і асаблівыя дзеці»:** па рабоце з дзецьмі-інвалідамі |
| **«Гродназнаўства»:** па краязнаўчай дзейнасці |

Дзякуючы нераўнадушным бібліятэкарам у 2015–2018 гадах у ДУК «ЦБС г. Гродна» паспяхова рэалізавалі:

| **сацыяльныя праекты** |
|---|
| **«Гродна: пачуць нябачнае»:** краязнаўчы тыфлапраект |
| **«Гродна: гісторыя ў гуку»:** па агучванні і выданні аўдыякніг гродзенскіх гісторыкаў і краязнаўцаў |
| **«Гісторыя на кончыках пальцаў»:** |

| |
|---|
| перавод кніг па гісторыі Гродна ў шрыфт Брайля |
| **«Цёплыя кнігі»:**<br>па стварэнні тактыльных кніг<br>для невідушчых дзяцей |
| **Стварэнне аўдыядэскрыпцыі**<br>да мастацкіх фільмаў |

Сваю дзейнасць бібліятэкі каардынуюць з грамадскімі і дзяржаўнымі арганізацыямі.

| **Сацыяльныя партнёры:** |
|---|
| Гродзенскае абласное аддзяленне<br>грамадскага аб’яднання<br>«Саюз пісьменнікаў Беларусі» |
| Аддзел адукацыі, спорту і турызму<br>адміністрацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна |
| Установа культуры «Гродзенскі дзяржаўны<br>гісторыка-археалагічны музей» |
| Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ЮрСаПрынт» |
| Гродзенскае абласное адзяленне грамадскага<br>аб’яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» |
| Прыватнае ўнітарнае прадпрыемства «Фільтр»<br>грамадскага аб’яднання «Беларускае таварыства<br>інвалідаў па зроку» |
| Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гродзенская<br>спецыяльная агульнаадукацыйная школа-інтэрнат для<br>дзяцей з парушэннямі зроку» |
| Дзяржаўная ўстановы адукацыі «Спецыяльны яслі-сад<br>№ 81 для дзяцей з парушэннямі зроку» |
| Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт<br>імя Янкі Купалы» |

Для невідушчых карыстальнікаў і людзей з аслабленым зрокам у структуры ДУК «ЦБС г. Гродна» з 2010 года працуе спецыяльная бібліятэка для інвалідаў па зроку.

Штогод установу наведваюць больш за 600 чытачоў, амаль палова з іх – людзі з парушэннем зроку.





**Чытачы СБІЗ**





Бібліятэчная ўстанова з’яўляецца адзіным спецыялізаваным інфармацыйным цэнтрам у г. Гродне для невідушчых людзей і прадастаўляе ім у карыстанне шэраг адаптаваных інфармацыйных рэсурсаў.





**Фонд СБІЗ**





**Да паслуг карыстальнікаў у бібліятэцы прадстаўлены:**

- 2 аўтаматызаваныя рабочыя месцы;
- электронная лупа Eclipse (павялічвае шрыфт у 32 разы);
- Daisyplaer для агучвання тэкстаў;
- праграма экраннага доступу JAWS і сінтэзатар маўлення;
- анлайн-бібліятэка «Логас»;
- публічны цэнтр прававой інфармацыі.





**Абсталяванне для чытачоў з аслабленым зрокам**



Штогод для людзей з абмежаваннямі па здароўі ладзіцца каля **30** інфармацыйна-масавых мерапрыемстваў.

СБІЗ кожны год удзельнічае ў міжнароднай акцыі **«Чытаем дзецям пра вайну»**, ініцыяванай у 2010 годзе Самарскай абласной дзіцячай бібліятэкай (РФ). Сэнс акцыі – адначасовае чытанне твораў пра вайну ў розных установах – бібліятэках, школах, дзіцячых садах, сацыяльных прытулках. Па ініцыятыве Раісы Уладзіміраўны Ланеўскай, бібліятэкара СБІЗ, на радыё прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Фільтр» грамадскага аб’яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку» гучалі урыўкі з аўдыякнігі С. Алексіевіч «Апошнія сведкі», паэмы А. Твардоўскага «Васіль Цёркін», была аб’яўлена хвіліна маўчання.

Значная ўвага надаецца **духоўна-маральнаму выхаванню** карыстальнікаў. На працягу апошніх гадоў прайшлі гадзіны інфармацыі «Аб духоўным і душэўным», «Наша жыццё», урокі дабрыні «Мы разам», «Колеры жыцця» і інш. У 2016 годзе для чытачоў была арганізавана **сустрэча з пратаіерэем** Вячаславам Гаплічнікам, настаяцелем храма ў гонар прападобнамучаніка Афанасія Брэсцкага, які расказаў пра свята Вялікдзень, адказаў на шматлікія пытанні ўдзельнікаў мерапрыемства.





**Сустрэча
з пратаіерэем В. Гаплічнікам**

У 2016 годзе ў бібліятэцы прайшоў незвычайны **«Адкрыты ўрок»**. Тут сабраліся выпускнікі і настаўнікі Гродзенскай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку, якія вучыліся і працавалі ў ёй шмат гадоў таму. Ганаровым госцем мерапрыемства быў паэт В.С. Кудлачоў, выпускнік школы-інтэрната 1954 года, які 52 гады працаваў у ёй настаўнікам музыкі. Сярод гасцей мерапрыемства былі былы дырэктар школы-інтэрната Т.А. Чарвякова, намеснік па выхаваўчай рабоце Т.І. Ляшчук і завуч школы Н.Г. Клюева. Чуллівыя моманты сустрэчы – загучаўшыя галасы настаўнікаў, запісаныя ў школьны аўдыяальбом, па ініцыятыве В.С. Кудлачова, і ўспаміны прысутных настаўнікаў.







**Адкрыты ўрок»:**
сустрэча выпускнікоў школы-інтэрната
для дзяцей з парушэннямі зроку

Штогод у бібліятэцы праходзіць **конкурс брайлістаў «Словы пад пальцамі ляцелі...»** на лепшага чытача выданняў рэльефна-кропкавым шрыфтам.





**Удзельнікі конкурсу брайлістаў**



У бібліятэцы з мэтай арганізацыі вольнага часу невідушчых людзей дзейнічае **інтэлектуальны клуб «Эрудыт»**, які налічвае 11 удзельнікаў. Штогод члены аб’яднання бяруць удзел у турніры «Моцная сям’я – моцная дзяржава» (г. Ваўкавыск), фестывалі «Кубак Валока і Вісека» (г. Ваўкавыск), адкрытым абласным інтэграваным інтэлектуальным турніры «Белы кій» (г. Гродна), інтэлектуальным паядынку з расійскай камандай «Суразмоўца» (г. Цвер) з дапамогай праграмы Skype.









**Удзельнікі інтэлектуальнага клуба «Эрудыт»**

Раіса Уладзіміраўна Ланеўская брала ўдзел у праекце сацыяльна-культурнай установы «МоцАрт» (г. Мінск) **па стварэнні аўдыядэскрыпцыі да мастацкіх фільмаў**. У 2016 годзе ў кінатэатры «Чырвоная зорка» ў рамках праекта «Бязмежнае кіно» адбыўся паказ кінафільма «Белыя росы» з аўдыядэскрыпцыяй, на які прыйшлі дзясяткі людзей з аслабленым зрокам і невідушчыя, іх родныя і блізкія.

Аўдыядэскрыпцыя, або тыфлакаментарый – закадравы тэкст для прагляду фільма, які дапамагае невідушчаму ўявіць тое, што адбываецца на экране. Дыктар агучвае ключавыя дзеянні, знешні выгляд герояў фільма, месца падзей і іншыя важныя візуальныя дэталі.

Тыфлакаментарыі «Белых росаў» падрыхтавала Р.У. Ланеўская, якая вучылася мастацтву апісання жывапісу, фільмаў і скульптур у польскіх тыфлакаментатараў. Падрыхтоўка аўдыядэскрыпцыі патрабуе немалых намаганняў. Каментарыі павінны быць максімальна змястоўнымі і аб'ектыўнымі. У той жа час усе тлумачэнні – лаканічныя, паколькі дыктару неабходна ўкласціся ў прамежак паміж рэплікамі герояў. Для кожнай сцэны Раіса Уладзіміраўна рыхтавала некалькі варыянтаў, кожны прагаворвала сама і звярала з «хранаметражам», а затым, калі гэта было патрэбна, скарачала або цалкам перараблялa. У выніку тыфлакаментарыі былі зроблены так, што яны на перашкаджалі асноўнаму тэксту, а акцэнты былі расстаўлены ў тых месцах, на якія людзі з добрым зрокам не заўсёды звярталі ўвагу. Прагляд фільма ў цёплай атмасферы падарыў прысутным масу станоўчых эмоцый.





**Паказ кінафільма «Белыя росы» з аўдыядэскрыпцыяй**

**27 сакавіка 2018 года** ў СБІЗ адбылася прэзентацыя незвычайных кніг для сляпых дзяцей і дзяцей са слабым зрокам, падораных бібліятэцы дабрачынным фондам «Ілюстраваныя кніжкі для маленькіх сляпых дзяцей» (РФ) у межах XXV Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, якую наведала загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦБ імя А. Макаёнка Наталля Юр'еўна Наземцава. Кнігі створаны з улікам асаблівасцяў глядзельнага і тактыльнага ўспрымання малюнкаў дзецьмі з парушэннямі зроку: адзін камплект – гэта тры ў адным, куды ўваходзіць кніжка невялікага фармату з плоскадрукаваным тэкстам, кніжка з ілюстрацыямі і набор картак з пытаннямі і заданнямі па матывах казкі. Падчас прэзентацыі з ілюстраванымі кнігамі пазнаёміліся выхаванцы дзяржаўнай установы адукацыі «Спецыяльны яслі-сад № 81 для дзяцей з парушэннямі зроку», чытачы бібліятэкі, удзельнікі абласнога семінара старшынь пярвічных арганізацый ГА «БелТІЗ», журналісты.








**Тэсціраванне «Ілюстраваных кніг»**

А ўжо **29 сакавіка** выхаванцы старшых груп яслі-сада № 81 для дзяцей з парушэннямі зроку разам з бібліятэкарам СБІЗ разглядалі і чыталі маляўнічыя кніжкі з аб'ёмнымі малюнкамі «Крэсіва» і «Спадарыня Мяцеліца». Асаблівую цікавасць у дзяцей выклікалі канструкцыі на плоскай старонцы: дупло ў дубе, калодзеж, дом спадарыні Мяцеліцы.

Вялікую ўвагу бібліятэкары ДУК «ЦБС г. Гродна» надаюць збору матэрыялаў па гісторыка-культурнай спадчыне Гродна і распаўсюджванню краязнаўчых ведаў сярод карыстальнікаў. Раней у фондзе спецыяльнай бібліятэкі краязнаўчая літаратура існавала толькі ў традыцыйным друкаваным выглядзе, што рабіла яе недаступнай для невідушчых чытачоў. У 2014 годзе супрацоўнікі АБМ ЦБ імя А. Макаёнка прапанавалі ідэю агучвання краязнаўчых выданняў.

У 2014–2015 гадах быў паспяхова рэалізаваны **тыфлакраязнаўчы праект «Гродна: пачуць нябачнае».**

**Мэта праекта** – стварэнне даступнага інфармацыйнага асяроддзя для людзей з аслабленым зрокам.

**Задачы праекта:**

- фарміраванне фонду краязнаўчай літаратуры на спецыяльных носьбітах інфармацыі, адаптаваных для невідушчых (аўдыядыск);
- распаўсюджванне краязнаўчых ведаў сярод людзей з парушэннем зроку.

На студыі «Гуказапіс» (г. Мінск) былі агучаны чатыры кнігі краязнаўчай тэматыкі і прадстаўлены ў выглядзе аўдыякнігі з аднайменнай з праектам назвай:

- «Горадна, Горадзен, Гродна» А. Марціновіча;
- «О парке Жилибера и зоопарке Кохановского» В. Саяпіна;
- «Гродно: театр, кино, цирк» В. Саяпіна, Т. Касатай;
- «Красная книга Гродно» А. Павача.






## **Гродна: пачуць нябачнае»:** аўдыякніга

У 2015 годзе ў бібліятэцы адбылася прэзентацыя тыфлапраекта **«Гродна: пачуць нябачнае»**. У зале прысутнічалі тыя, хто дапамагаў ажыццявіць праект – галоўны рэдактар выдавецтва «ЮрСаПрынт» А. Рыжы, гісторык А. Вашкевіч, дыктар В. Мароз, рэдактар інтэрнэт-радыё грамадскага аб’яднання «Беларускае таварыстава інвалідаў па зроку» А. Калоша, аўтар песні «Вальс лёсу», якая паслужыла лейтматывам да агучаных кніг, І. Жыбіна і выканаўца А. Багданаў, фундатары – прадстаўнікі адкрытага акцыянернага таварыства «Гродзенскі мясакамбінат». Аўдыякнігі «Гродна: пачуць нябачнае» атрымалі ўсе гродзенскія гарадскія бібліятэкі, спецыяльныя бібліятэкі для інвалідаў па зроку ў рэспубліцы і абласныя грамадскія аб’яднанні «БелТІЗ».





## **Гродна: пачуць нябачнае»:** прэзентацыя тыфлапраекта

У 2017 годзе быў распачаты **праект па агучванні кніг гродзенскіх краязнаўцаў «Гродна: гісторыя ў гуку»**, кіраўніком і душой якога стала загадчык АБМ ЦБ імя А. Макаёнка Наземцава Н.Ю.

**Мэта праекта** – далучэнне людзей з аслабленым зрокам да гісторыка-культурнай спадчыны Гродна.

**Задачы праекта:**

- папаўненне краязнаўчага фонду бібліятэк электроннымі дакументамі;
- распаўсюджванне краязнаўчых ведаў сярод карыстальнікаў з парушэннем зроку.

У падтрымку праекта Наталля Юр'еўна арганізавала цыкл мерапрыемстваў пад назвай **«Гісторыя, якую трэба захоўваць»**, якія прайшлі з удзелам прадстаўнікоў гродзенскага выдавецтва «ЮрСаПрынт», гісторыкаў і краязнаўцаў.

**13 ліпеня** арганізавалі выставу выданняў па гісторыі Гродна для супрацоўнікаў абласнога ўпраўлення АСБ «Беларусбанк». Супрацоўнікі банка пазнаёміліся з фотапраектам гісторыка А.А. Перагудава «Сустрэча стагоддзяў», пагарталі кнігі краязнаўцы В.Ю. Саяпіна. Пра гісторыю горада, захаваную на рэдкіх фотаздымках, расказаў галоўны рэдактар выдавецтва «ЮрСаПрынт» А.А. Рыжы. Слухачы дзяліліся асабістымі ўспамінамі, пазнаючы на фота гістарычныя і архітэктурныя аб'екты.



## Гісторыя, якую трэба захоўваць»:
### выстава ў АСБ «Беларусбанк»

**20 ліпеня** чарговае мерапрыемства прайшло для супрацоўнікаў адкрытага акцыянернага таварыства «Гродзенскі мясакамбінат». Разам з бібліятэкарамі падтрымаць праект прыйшоў гісторык А.Ф. Вашкевіч, які расказаў пра брэнды Гродна: завод па вытворчасці матацыклаў, піўны завод, пераплётную фабрыку, друкарню Лапіных. У наступны раз для супрацоўнікаў прадпрыемства арганізавалі гістарычнае падарожжа, звязанае з легендамі старога Гродна. З аповеду гісторыкаў прысутныя пачулі аб святым Казіміры, аб вялікім князі літоўскім Вітаўце, памятным знаку Давыду Гарадзенскаму, аб гербе Гродна, знакамітых вежах Кася і Бася. Калектыву Гродзенскага мясакамбіната таксама было прапанавана гістарычнае падарожжа «На хвалі памяці».

**27 ліпеня** ў межах праекта «Гродна: гісторыя ў гуку» з гісторыяй горада пазнаёміліся супрацоўнікі адкрытага акцыянернага таварыства «Радыёхваля». Разам з бібліятэкарамі перагарнулі старонкі «Чырвонай кнігі Гродна» гісторыка А. Павача і здзейснілі віртуальную прагулку па горадзе: ад памятнага знака Фары Вітаўта да дома купца Мураўёва; па адной з самых старых вуліц горада Замкавай – да камяніцы Масальскіх і Вялікай харальнай сінагогі.

**19 кастрычніка** калектыў адкрытага акцыянернага таварыства «Гроднахлебпрам» паслухаў гісторыю страчаных архітэктурных будынкаў Гродна і пабачыў працы гісторыка А.А. Перагудава з яго





н

фотапраекта «Сустрэча стагоддзяў».

**28 мая** 2018 года ў гарадской цэнтральнай бібліятэцы імя А. Макаёнка адбылося заключнае мерапрыемства праекта – прэзентацыя аўдыякнігі «Гродна: гісторыя ў гуку», прызначанай, у першую чаргу, для невідушчых і людзей са слабым зрокам. У выніку працы вялікай каманды з’явіліся два дыскі, на якіх запісаны аўдыяверсіі дзевяці кніг галасамі дзесяці дыктараў:

- «Гісторыя Гродзенскіх плошчаў» В.Ю. Саяпіна;
- «Гродзенскія паводкі ва ўспамінах і фотаздымках» В.Ю. Саяпіна;
- «Гродзенскія помнікі і скульптуры» В.Ю. Саяпіна;
- «Гродна і гродзенцы. 1944–1974» В.Ю. Саяпіна;
- «Маленькія мосцікі ў Гродне» В.Ю. Саяпіна;
- «Страчаная архітэктура Гродна» В.Ю. Саяпіна;
- «50 гродзенскіх вуліц» В.Ю. Саяпіна;
- «На гродзенскім бруку» В.Ю. Саяпіна і А.Ф. Вашкевіча;
- «Пад крылом Каложы» А. Павача.

Падчас мерапрыемства цёплыя словы гучалі ў адрас тых, хто дапамагаў у ажыццяўленні праекта – рэжысёра ТРК «Гродна» А. Палешчука, галоўнага рэдактара выдавецтва «ЮрСаПрынт» А. Рыжага, каманды радыёдзіджэяў «Радыё Гродна» і начальніка аддзела радыёвяшчання ТРК «Гродна» З. Крыловай, супрацоўнікаў гродзенскага абласнога аддзялення ГА «БелТІЗ» і яго старшыні І. Новікавай, вядучай і выкладчыка «Школы радыёвядучых» У. Шубко, журналістаў, кіраўнікоў гродзенскіх прадпрыемстваў, якія выдаткавалі сродкі на праект, супрацоўнікаў сацыяльна-культурнай установы «МоцАрт» (г. Мінск) і інш.

Аўдыякніга «Гродна: гісторыя ў гуку» стала даступнай ва ўсіх гарадскіх бібліятэках сістэмы, на сайтах ЦБС г. Гродна і выдавецтва «ЮрСаПрынт».











**Гродна: гісторыя ў гуку»:** прэзентацыя праекта

Такім чынам, чытачы з парушэннем зроку атрымалі магчымасць пачуць гісторыю роднага горада. У бібліятэках сістэмы створаны і пастаянна папаўняецца фонд краязнаўчай літаратуры на электронных носьбітах. Гэта садзейнічае актывізацыі чытацкай цікавасці да гісторыі і

культуры роднага горада, распаўсюджванню краязнаўчых ведаў сярод карыстальнікаў з абмежаваннямі па здароўі.

У 2017 годзе Р.У. Ланеўская распачала работу ў межах **праекта «Гісторыя на кончыках пальцаў»** (пераклад кніг краязнаўчай тэматыкі ў шрыфт Брайля).

**Мэта праекта** – папулярызацыя кніг па гісторыі Гродна сярод невідушчых людзей.

**Задачы праекта:**

- стварэнне ў СБІЗ фонду краязнаўчай літаратуры, выкананай шрыфтам Брайля;
- распаўсюджванне краязнаўчых ведаў сярод людзей з аслабленым зрокам.

У выніку ў фондзе бібліятэкі з'явіліся 2 кнігі гродзенскага краязнаўцы В.Ю. Саяпіна пра мінулае Гродна, выкананыя рэльефна-кропкавым шрыфтам:

- «Маленькія мосцікі ў Гродне»;
- «Гісторыя Гродзенскіх плошчаў».

Дапамогу ў падрыхтоўцы выданняў аказалі супрацоўнікі інфармацыйнага цэнтра грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку».

Праект па перакладзе кніг краязнаўчай тэматыкі ў шрыфт Брайля працягваецца ў 2018 годзе.





## Кнігі па гісторыі Гродна, выкананыя шрыфтам Брайля

Штогод СБІЗ наведваюць каля 30 дзяцей – выхаванцаў Гродзенскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку. У межах плана мерапрыемстваў **«Мы і асаблівыя дзеці»** для іх ладзяць літаратурныя віктарыны і гучныя чытанні. Р.У. Ланеўская імкнецца спрыяць адукацыі, пашырэнню кругагляду і арганізацыі карыснага вольнага часу дзяцей і падлеткаў. Да кожнага дзіцяці Раіса Уладзіміраўна шукае індывідуальны падыход, а пры падрыхтоўцы мерапрыемстваў ўлічвае іх магчымасці. Самым галоўным пры абслугоўванні дзяцей з абмежаваннямі па здароўі яна лічыць увагу, чуласць і добразычлівасць.

Значную частку інфармацыі пра навакольны свет чалавек атрымлівае візуальным спосабам. Для людзей з парушэннем зроку пазнанне свету ўяўляе цяжкую задачу. Больш востра гэта праблема стаіць перад дзецьмі, жыццёвы вопыт якіх яшчэ невялікі, а асноўным спосабам пазнання з’яўляюцца тактыльныя адчуванні.

У 2015 годзе супрацоўнікамі АБМ ЦБ імя А. Макаёнка і бібліятэкарам СБІЗ была распачата работа ў межах **праекта «Цёплыя кнігі»** па стварэнні тактыльных кніг для невідушчых дзяцей.

**Тактыльныя кнігі** – выданні з рэльефнымі малюнкамі, выкананымі з розных матэрыялаў, якія на навобмацак максімальна набліжаны да арыгіналу. Акрамя таго, кнігі змяшчаюць шрыфт Брайля, які з’яўляецца тлумачэннем і варыянтам гульні.

**Мэта праекта** – далучэнне дзяцей з парушэннем зроку да свету кніжнай культуры і прадастаўленне магчымасці пашырэння кругагляду.

**Задачы праекта:**

- стварыць у СБІЗ фонд рукадзельных тактыльных кніг для дзяцей з аслабленым зрокам і невідушчых;
- прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы невідушчых дзяцей праз выступленні ў сродках масавай інфармацыі, сацыяльных сетках.

Унікальнасць праекта ў тым, што ў фондах публічных і школьных бібліятэк г. Гродна на той момант такіх выданняў не было.

Для рэалізацыі праекту «Цёплыя кнігі» былі выкарыстаны спонсарскія сродкі, выдзеленыя адкрытым акцыянерным таварыствам «Малочны мір».

Пры вырабе тактыльных кніг удзельнікі праекта кіраваліся рэкамендацыямі, прадстаўленымі ў расійскім і фінскім стандартах тактыльнай кнігі для маленькіх сляпых дзяцей. Для стварэння «цёплых» кніг выкарыстоўвалі мех, шэрсць, лямец, скуру, тасьму, гузікі і іншыя матэрыялы.

Першыя дзве кнігі былі створаны членамі клуба аматараў рукадзелля «Радасць» гарадской бібліятэкі № 10. У падрыхтоўцы кніг прынімалі ўдзел валанцёры – студэнты педагагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і майстрыха, член народнага аб'яднання майстроў і мастакоў «Гарадзенскі каларыт» В.Ю. Генюш.






**Выраб цёплых кніг»**







У працэсе вырабу кнігі тэсціравалі чытачы-інваліды па зроку і вучні Гродзенскай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку. Тыфлапедагогі зазначылі, што дзецям, якія асвояць гэтыя кнігі ў раннім узросце, будзе лягчэй вучыцца ў школе.











## Тэсціраванне тактыльных кніг

У выніку рэалізацыі праекту «Цёплыя кнігі» было зроблена 5 рукадзельных тактыльных кніг пазнавальнай і рэабілітацыйнай накіраванасці:

- «Шчанюк» С. Міхалкова;
- вершы А. Барто;
- зборнік дзіцячай паэзіі;
- казка «Калабок»;
- казка «Каласок».









## Тактыльныя кнігі, створаныя ў СБІЗ

На заключнае мерапрыемства «Свет на кончыках пальцаў» праекта «Цёплыя кнігі» **23 сакавіка 2016 года** ў СБІЗ сабраліся стваральнікі кніг, валанцёры, тыфлапедагогі, чытачы, прадстаўнікі грамадскага аб’яднання «БелТІЗ», бібліятэкары. Да ўвагі прысутных былі прадстаўлены тактыльныя кнігі для невідушчых дзяцей, якія сталі даступныя для юных чытачоў у спецыяльнай бібліятэцы.






**«Свет на кончыках пальцаў»:** заключнае мерапрыемства праекта

У 2017 годзе ідэю бібліятэкараў падтрымалі педагогі школ агульнай сярэдняй адукацыі Кастрычніцкага раёна г. Гродна. Для іх **17 сакавіка** ў ЦБ імя А. Макаёнка быў праведзены майстар-клас па вырабе тактыльных кніг, падчас якога гаварылі пра методыку стварэння тактыльных кніг, патрабаванні да выкарыстоўваемых матэрыялаў і інш.





## Майстар-клас па вырабе тактыльных кніг

**7 чэрвеня** ў Сярэдняй школе № 35 імя М.А. Волкава адбылася передача першых тактыльных кніг у фонд СБІЗ. Пасля было перададзена яшчэ 17 «цёплых кніг», створаных настаўнікамі і вучнямі ў перыяд летніх канікул.





## Перадача «цёплых кніг» у СБІЗ

Тактыльныя кнігі ў СБІЗ выкарыстоўваюцца для заняткаў з невідушчымі дзецьмі дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Дзеля сустрэчы з «цёплымі кнігамі» бібліятэку наведвалі вучні школы-інтэрната для дзяцей з парушэннямі зроку ў суправаджэнні настаўнікаў. Для іх ладзілі гадзіны рэабілітацыі «Казка на кончыках пальцаў», «Спазнаем свет разам» і інш.  Чытаючы тактыльныя кнігі, дзеці знаёмяцца з казкамі, жывёламі, рэчамі хатняга ўжытку. Абмацванне паменшаных мадэляў прадметаў дае магчымасць лягчэй засвоіць і прыняць іх у рэальным свеце. Такім чынам, тактыльныя кнігі не толькі спрыяюць навучанню маленькіх чытачоў з аслабленым зрокам, але і пашыраюць іх кругагляд, дапамагаюць дзецям развіць навык дотыку.

Пошук новых формаў і метадаў работы па абслугоўванні чытачоў з абмежаваннямі па здароўі працягваецца. Поспех у працы абумоўлены

вялікім жаданнем бібліятэкараў ДУК «ЦБС г. Гродна» аказваць асаблівым карыстальнікам дапамогу і падтрымку.

# ЗМЕСТ

Бібліятэка – адкрыты свет:
з вопыту работы па абслугоўванні
невідушчых карыстальнікаў
у ДУК «ЦБС г. Гродна» 1

# БІБЛІЯТЭКА – АДКРЫТЫ СВЕТ

З вопыту работы па абслугоўванні невідушчых карыстальнікаў у ДУК «ЦБС г. Гродна»


Складальнік А. С. Рубель

Рэдактар Н. Ю. Наземцава